ЗАЦВЯРДЖАЮ
Старшыня прафкама студэнтаў
БрДУ імя А.С. Пушкіна
_______ Р.В. Чуль
«19» 10 2015 г.

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дэкан філалагічнага факультэта
БрДУ імя А.С. Пушкіна
_______ В.А. Фелькіна
«__» ________ 2015 г.

**ПАЛАЖЭННЕ**
**АБ БРЭЙН-РЫНГУ «ЖУРНАЛІСТЫКА Ў 2015 ГОДЗЕ»**

## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

Брэйн-рынг «Журналістыка ў 2015 годзе» з'яўляецца **адкрытым**, у ім могуць прыняць удзел студэнты розных факультэтаў БрДУ імя А.С. Пушкіна, вучні агульнаадукацыйных устаноў Брэсцкай вобласці (па запрашэнні аргкамітэта).

## АРГАНІЗАТАР БРЭЙН-РЫНГУ

**Арганізатарамі** адкрытага брэйн-рынгу «Журналістыка ў 2015 годзе» з'яўляюцца кафедра журналістыкі філалагічнага факультэта, прафсаюзны камітэт студэнтаў Установы адукацыі «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна».

## АРГКАМІТЭТ БРЭЙН-РЫНГУ

1. Скібіцкая Л.В. – загадчык кафедры журналістыкі, кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
2. Клундук С.С. – дацэнт кафедры журналістыкі, кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
3. Абрамава Я.І. – дацэнт кафедры журналістыкі, кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
4. Чуль Р.В. – старшыня прафкама студэнтаў.

## МЭТА І ЗАДАЧЫ БРЭЙН-РЫНГУ

**Мэта і задачы** брэйн-рынгу – актуалізаваць цікавасць моладзі (вучняў і студэнтаў) да журналістыкі як прафесіі і як вобласці літаратурнай дзейнасці.

## УМОВЫ ПРАВЯДЗЕННЯ БРЭЙН-РЫНГУ

Для ўдзелу ў брэйн-рынгу **да 01 лістапада 2015 года** неабходна даслаць **заяўку** на электронны адрас кафедры журналістыкі (e-mail: kafjurn@brsu.brest.by), якая ўтрымлівае ўсе неабходныя звесткі пра

ўдзельніка (прозвішча, імя, імя па бацьку; навучальная ўстанова, факультэт, група, клас; кантактны тэлефон) (форма заяўкі прыкладваецца).

Кожны факультэт БрДУ імя А.С. Пушкіна можа прадставіць аднаго ўдзельніка; кожная агульнаадукацыйная ўстанова Брэсцкай вобласці (школа, ліцэй, гімназія) можа прадставіць 2 удзельнікі. Каманды гульні фарміруюцца падчас правядзення брэйн-рынгу (11 лістапада 2015 года).

Брэйн-рынг праводзіцца **11 лістапада 2015 года** на базе БрДУ імя А.С. Пушкіна (аўд. 328 вучэбнага корпуса № 2, вул. Міцкевіча, 28):

- рэгістрацыя ўдзельнікаў – з 14.30 да 14.50 (аўд. 328);
- пачатак брэйн-рынгу – а 15.00 гадзіне;
- узнагароджанне – 16.30.

## ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ БРЭЙН-РЫНГУ І ЎЗНАГАРОДЖАННЕ ПЕРАМОЖЦАЎ

Ацэньвае працу каманд гульні і падводзіць агульныя вынікі **журы** ў наступным складзе:

1. Скібіцкая Л.В. – загадчык кафедры журналістыкі, кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
2. Клундук С.С. – дацэнт кафедры журналістыкі, кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
3. Абрамава Я.І. – дацэнт кафедры журналістыкі, кандыдат філалагічных навук, дацэнт.

## ФІНАНСАВАННЕ МЕРАПРЫЕМСТВА

Каманда пераможцаў узнагароджваецца падарункамі, прадстаўленымі прафкамам студэнтаў.

## ДАДАТКОВАЯ ІНФАРМАЦЫЯ

**Камандзіровачныя выдаткі** для ўдзельнікаў брэйн-рынгу – за кошт камандзіруючых арганізацый.

## КАНТАКТЫ

Адрас для падачы заявак: kafjurn@brsu.brest.by

Кантактныя тэлефоны: + 8 (016) 21 63 50 – кафедра журналістыкі; + 375 29 724 30 85 – Клундук Святлана Сяргееўна – дацэнт кафедры журналістыкі, кандыдат філалагічных навук, дацэнт.